ББК 63.3 (2Б)
Г 516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэцэнзенты:* загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.І. Брыгадзін; загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.Я. Новікаў.

*Пад агульнай рэдакцыяй* прафесара В. М. Фаміна,
дацэнта У. В. Тугая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дапаможнік уключае ў сябе артыкулы па найбольш актуальных праблемах гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцю з'яўляецца навуковы падыход да асвятлення разглядаемых пытанняў, імкненне выйсці за межы панаваўшых догмаў.

Прызначаецца студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў.

ISBN 985-60-87-56-2
© Калектыў аўтараў, 1994.
© *Арыгінал-макет:* А.А. Пакала, 1994.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Вучэбны дапаможнік для студэнтаў гістарычных факультэтаў

*Мінск 1994*

*Вучэбнае выданне*

# Гісторыя Беларусі

*Вучэбны дапаможнік*
*для студэнтаў гістарычных факультэтаў*

*Карэктар* А. В. Сідарэнка

Падпісана ў друк 13.12.94. Фармат 60×84 1/16. Папера друк № 2.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,5. Ум. фарб.-адб. 8,00. Ул.-выд. арк. 6,7
Тыраж 200 экз. Заказ 1053. Цана 4500 р.

Ратапрынт БДПУ. 220809, г. Мінск, вул. Савецкая, 18.

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА .......... 3
БАЛТЫ І СЛАВЯНЕ НА БЕЛАРУСІ (*С. А. Адамовіч, В. І. Шадыра*) .......... 4
ПРАБЛЕМА ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КАНЕЦ XIII — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIV СТ. (*А. Ф. Рацько*) .......... 8
НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII — XIX СТ. (*С. А. Адамовіч*) .......... 16
УДЗЕЛ ТАТАРАЎ-МУСУЛЬМАН У ПАЎСТАННІ 1794 ГОДА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ (*І. Б. Канапацкі*) .......... 23
ХТО ПЕРАМОГ НА Р. БЯРЭЗІНЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ 1812 ГОДА? (*І. А. Груша*) .......... 29
НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ДВАРАНСКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ НА БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX — ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ) (*А. П. Жытко*) .......... 36
АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ДЛЯ ЧЫГУНАК БЕЛАРУСІ Ў 1900-1913 ГГ. (*П. А. Тупік*) .......... 44
БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (*М. В. Цуба*) .......... 53
АСВЯТЛЕННЕ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК У 1919 Г. У ДРУКУ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ (*У. У. Куніцкі*) .......... 62
ДА ПЫТАННЯ АБ УТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА КАМІТЭТА АБ'ЯДНАНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (САКАВІК — ЛІПЕНЬ 1917 Г.) (*М. Я. Сяменчык*) .......... 67
ПАЛІТЫЧНЫЯ РЭПРЭСІІ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 20-Х — 30-Я ГАДЫ (*М. К. Сакалоў*) .......... 78
БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ НАРКАМАСВЕТЫ Ў 20-Я ГАДЫ (*У. В. Тугай, В. Ц. Ісаеў*) .......... 87
ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.) (*У. В. Тугай, В. М. Фамін*) .......... 92
ФАРМІРАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ АКРУГІ "НАВАГРУДАК" (*С. П. Барадзін*) .......... 96
ПРАФСАЮЗЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ САВЕЦКАГА ТАТАЛІТАРЫЗМУ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945-1985) (*Ф. А. Шумскі*) .......... 107

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абставінах нямецкі ўрад быў вымушаны адклікаць свае войскі з Усходняга фронту. У выніку чаго войскі Савецкай Расіі пачалі прасоўвацца далей на захад, займаючы тэрыторыю Беларусі. У пачатку снежня 1918 года немцы перадалі ўладу ў Мінску савецкім органам. Рада і ўрад БНР былі вымушаны эвакуіравацца ў Гродна і знаходзіліся там да пачатку красавіка 1919 года, г.зн., да выхаду германскіх войск з Гродзеншчыны. Такім чынам, ліквідацыя акупацыйнага рэжыму Германіі і прыход на Беларусь расійскіх войск, прывялі да немагчымасці далейшага існавання Беларускай Народнай Рэспублікі.

## АСВЯТЛЕННЕ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК У 1919 Г. У ДРУКУ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ

У.У. Куніцкі

У канцы 1918 — пачатку 1919 гг. актыўнымі ўдзельнікамі вызначэння лёсу народаў Беларусі з`явіліся расійскія бальшавікі і польскія нацыяналісты. Першыя ў студзені 1919 г. утварылі тут дзяржаву БССР, якая па сутнасці кіравалася з Масквы. Другія імкнуліся пашырыць сваю дзяржаву да межаў Рэчы Паспалітай 1772 г., куды ўваходзілі і беларускія землі. Таму ваенны канфлікт паміж імі за тэрыторыі Беларусі быў непазбежны, што і адбылося ў 1919 г. пасля таго як нямецкая армія іх пакінула.

Заходнія расійскія межы ад Украіны да Петраграда прыкрываў Заходні фронт, які быў утвораны ў лютым 1919 г. з Заходняй Арміі. На тэрыторыі Беларусі дзейнічала Беларуска-Літоўская армія, якая ў большасці складалася з беларусаў. Пасля заключэння 1 чэрвеня 1919 г. ваенна-палітычнага саюза паміж Расіяй, Украінай, Літвой, Латвіяй і Беларуссю, яна пачала значыцца як 16-я армія. Бальшавіцкі ўрад Расіі жадаў сам распараджацца падпарадкаванымі рэспублікам войскамі, як адзначалася ім "в интересах единства стратегии"[1]. Тым самым бальшавікі імкнуліся знішчыць усялякае нацыянальнае адценне нават у назве воінскіх часцей.

Вялікая ўвага надавалася ідэйнай апрацоўцы чырвонаармейцаў і насельніцтва. На тэрыторыі Беларусі для байцоў выдавалася газета "Красноармеец" (16 армія), "Красноармейская звезда" (17 дыв.), "К оружию" (Віцебскі ваенны камісарыят). З сярэдзіны 1919 г. тут пачалі распаўсюджвацца газеты РОСТА (Расійскага тэлеграфнага агенцтва). Акрамя таго так званыя партыйна-савецкія газеты Беларусі пачалі змяшчаць амаль у кожным нумары спецыяльную старонку для чырвонаармейцаў. Гэта датычыцца "Звезды", "Сохи и молота", "Факела" і

[1] Военно-исторический журнал. 1969. № 1. С. 7.



інш.

Якія ж ідэі распаўсюджвалі газеты сярод беларускага народа і байцоў Беларуска-Літоўскай арміі ў найбольш драматычныя моманты, калі польскія войскі пачалі захопліваць землі Беларусі? Як друк Беларусі і Заходняга фронту пабуджаў чырвонаармейцаў і насельніцтва на адпор захопнікам?

Як паказвае аналіз матэрыялаў друку, тэма барацьбы з наступаючай польскай арміяй не з`яўляецца галоўнай на старонках газет і лістовак фронту. Галоўны ўпор палітработнікі, кіруючыся ўказаннямі з Масквы, зрабілі на асвятленне падзей на франтах, дзе ішла барацьба з войскамі адмірала Калчака і генерала Дзянікіна. Народ Беларусі імкнуліся запэўніць у тым, што яго лёс залежыць ад выніку барацьбы на ўсходзе і поўдні. Хоць у той жа самы час пагроза аказацца парабаванымі Польшчай для народаў Літоўска-Беларускай рэспублікі была рэальнай.

Нягледзячы на гэта, мясцовыя газеты запэўнівалі сваіх чытачоў у тым, што захаванне рэвалюцыйнай (бальшавіцкай) улады ў Савецкай Расіі з`яўляецца галоўнай мэтай іх існавання. На гэта ўказваюць загалоўкі-аншлагі газет таго часу: "Все на борьбу за Советскую власть", "В защиту революции!" і г. д. Газетныя матэрыялы прызывалі байцоў Літоўска-Беларускай арміі мабілізаваць свае сілы на барацьбу з ворагам з Усходу. У гэтай сувязі друкавалася самая розная інфармацыя аб падзеях на ўсходзе: аб уступленні добраахвотнікаў у рады Чырвонай Арміі, аб паўстаннях сялян на тэрыторыі ворага і г. д.[1]

Адлюстраванне ж падзей на Заходнім фронце не з`явілася прадметам увагі друку Беларусі і фронту, таксама як і кіраўніцтва Чырвонай Арміі. Так, у справаздачы галоўнага камандавання Чырвонай Арміі Леніну ад 17 красавіка 1919 г. адзначалася, што "противник не в состоянии перейти к активным действиям"[2]. Такі вывад быў зроблены па прычыне недакладна вызначанага палітычнага становішча на Захадзе, дзе па разліку камуністаў чакалася актыўнае выступленне еўрапейскага пралетарыяту. У гэтых умовах фронт вызначаўся як другарадны. Бальшавіцкі друк запэўніваў чытачоў Беларусі ў тым, што "нет никаких оснований предполагать, что поляки смогут двинуть против Литвы и Белоруссии хоть сколь-нибудь серьёзную силу"[3]. Наконт наступлення польскіх войск у Ковенскім і Гродзенскім накірунках у друку адзначалася, што польскія "банды" зусім не страшныя і будуць ліквідаваны ў недалёкім будучым[4].

У значнай меры такая ацэнка сітуацыі была зроблена наўмысна.

[1] Красноармеец. 1919. 11 траўня; Стенная газета РОСТА. 1919. 23 жніўня.
[2] Директивы Главного командования. С. 308.
[3] Звезда. 1919. 8 сакавіка.
[4] Там жа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Улады ідэалагічна апрацоўвалі насельніцтва Беларусі і тым самым палягчалі сабе задачу накіравання яе жыхароў у месцы, дзе вырашаўся лёс бальшавікоў. Але вельмі часта прызыўнікі ў адказ на гэта хаваліся ў лясы. Дэзерцірства стала бічом Чырвонай Арміі. Мелі месца нават мяцяжы, накшталт Гомельскага.

Але нават пасля таго, як у канцы красавіка 1919 г. польскія войскі занялі Вільню, галоўная бальшавіцкая газета Беларусі "Звезда" па-ранейшаму адзначала, што існуючая ў Беларусі і Літве думка аб тым, што Заходні фронт павінен атрымаць дапамогу з усіх бакоў, з'яўляецца няправільнай. Газета падкрэслівала, што інтарэсы Беларусі і Літвы ў гэты перыяд не з'яўляюцца першымі па важнасці[1].

Такім чынам, бальшавіцкі друк на Беларусі па-ранейшаму ўказваў жыхарам і байцам аб прыярытэце барацьбы ў тых месцах, дзе існавала пагроза ўладзе бальшавікоў, за кошт сваіх інтарэсаў. Друк імкнуўся супакоіць насельніцтва і ўпэўніць, што ўрад непакоіцца аб яго лёсе. Але было зусім наадварот. Адзін з нямногіх артыкулаў, у якім усё ж звярталася ўвага чытачоў на небяспеку з боку Польшчы, называўся "Гроза с запада" і быў змешчаны ў "Известиях Гомельского Совета" ад 3 мая 1919 г. Аднак дабіцца нейкіх поспехаў на заходнім накірунку войскам, якія тут былі размешчаны, аказалася вельмі цяжка з прычыны змяншэння колькасці Беларуска-Літоўскай арміі з 25 тыс. у красавіку да 15 тыс. у маі. Некаторая колькасць чырвонаармейцаў была перакінута на Ўсход, а некаторая дэзерціравала. Таму заклік "Звезды" "... преодолеть трудности своими усилиями" не быў абгрунтаваны.[2]

Разам з тым пытанне аб месцы і ролі Заходняга фронту абвастрылася тады, калі да наступацельных дзеянняў палякаў далучыліся войскі Юдзеніча пад Петраградам. На гэты раз былі прыняты меры для папаўнення баявога саставу фронту. Яны вызначыліся формулай, выказанай "Правдой": "... главные силы на Урал, но в то же время крепкий заслон на Запад"[3]. Але тычылася гэта, у першую чаргу, петраградскага ўчастка Заходняга фронту. "Защищайте Красный Петроград!", "Питера не сдадим!", "Угроза Петрограду" — такімі загалоўкамі былі напоўнены старонкі "Звезды", "Красноармейца", "Сохи и молота" і інш.

Звесткі аб баявых дзеяннях пад Петраградам занялі асноўнае месца ў друку Заходняга фронту. Разам з тым становішча на польскім накірунку лічылася вельмі пагражальным. У сувязі з актывізацыяй польскіх войск чырвоныя часці пакінулі Пскоў, Маладзечна і іншыя гарады.[4] Некаторыя

---

[1] Звезда. 1919. 9 мая.

[2] Там жа.

[3] Правда. 1919. 27 красавіка.

[4] Бабылёв П.Н. На защите Советской республики. М.: Наука, 1981. С. 97.



газеты змясцілі матэрыялы, дзе звярталі ўвагу да становішча на Заходнім фронце. "Красноармеец" пісаў, што "... местные газеты пишут про Колчака и Деникина, но своему Западному фронту не посвящается ни одной заметки"[1].

Напрыклад, газета "Соха и молот", якая таксама распаўсюджвалася сярод байцоў, праблеме барацьбы з войскамі Калчака і Дзянікіна ў перыяд з 1 па 12 ліпеня прысвяціла больш 20 артыкулаў. Што датычыцца інфармацыі аб падзеях на Заходнім фронце, то яна амаль адсутнічала. Нягледзячы на наступленне польскіх войск, асвятленне спраў на польскім фронце не змянілася. Па-ранейшаму недаацэньвалася польская экспансія. Для друку як бы не існавала такой праблемы. У ліпені 1919 г., калі польскія войскі пагражалі Мінску, у ваенным і грамадскім друку Беларусі і фронту адзнаку як важнейшага атрымаў паўднёвы накірунак.

Апраўданне недастатковай увазе праблемам Заходняга фронту газеты знаходзілі ў эканамічных магчымасцях поўдня, багатага хлебам, карыснымі выкапнямі. "Южный фронт, — падкрэслівалася ў "Звезде", — имеет для пролетарской революции еще большее значение, чем наш ближайший Западный фронт, ибо там находятся главные артерии экономической жизни всей Советской России"[2].

Праз друк бальшавіцкае кіраўніцтва ўмацоўвала ў свядомасці жыхароў Беларусі ідэю аб тым, што страта тэрыторыі, дзе яны пражываюць, не з'яўляецца небяспечнай, паколькі не адбіваецца на палітычным і эканамічным становішчы Савецкай Расіі. Тым самым яскрава заўважаецца прыярытэт расійскіх інтарэсаў, а дакладней, бальшавіцкіх і спроба запэўніць народ Беларусі ў тым, што яго жыццёвыя інтарэсы з'яўляліся не першымі па важнасці. "Соха и молот", маючы на ўвазе заходнія тэрыторыі, у тым ліку і беларускія, пісала, што "излишняя трата сил для отобрания второстепенных в экономическом значении областей крайне нецелесообразно"[3].

Адначасова жыхароў Беларусі, воінаў 16-тай арміі і іншых часцей падвяргалі інтэнсіўнай ідэалагічнай апрацоўцы. Тоны бумагі пайшло на распаўсюджванне ідэй РКП(б), на тлумачэнне прычын грамадзянскай вайны, на ўтрыманне сялян у арміі, на прапаганду ідэй сусветнай рэвалюцыі. Воінаў Заходняга фронту ідэйна рыхтавалі да паходу ў краіны Еўропы, паколькі яны бліжэй за ўсіх знаходзіліся да цэнтраў сусветнай рэвалюцыі. Рубрыка "Мировая революция" стала пастаяннай у газетах таго часу. "Соха и молот" пісала наконт гэтага, што заходнееўрапейскі пралетарыят павінен быць упэўнены, што яго чакае падтрымка з Усходу. Таму неабходна падтрымліваць баявы дух нават у часы адступлення.

---

[1] Красноармеец. 1919. 10 ліпеня.

[2] Звезда. 1919. 4 ліпеня.

[3] Соха и молот. 1919. 17 ліпеня.

Перад падзеннем Мінска лічылася больш мэтазгодным, як сведчаць матэрыялы друку, пісаць аб здачы Палтавы Чырвонай Арміяй, аб дапамозе, якую неабходна аказаць Украіне, аб калчакаўскай агоніі, аб сусветнай рэвалюцыі. Але аб польскім фронце зноў не было надрукавана ніводнага артыкула, за выключэннем звестак з фронту. Больш таго, "Звезда" у каторы раз неабгрунтавана даказвала, што калі газета дойдзе да чытачоў, пад Радашковічамі будзе развівацца чырвоны сцяг сацыялістычнай рэвалюцыі[1].

Дапускаючы страту тэрыторый Беларусі, бальшавіцкая прапаганда рабіла ўсё, каб атрымаць на пэўным ўзроўні баяздольнасць войск, з тым, каб зусім не агаліць фронт. Вядомы ваенны спецыяліст Н.Е. Какурын адзначаў у гэтай сувязі, што абмежаванасць мэты палякаў у сваіх тэрытарыяльных патрабаваннях (межы 1772 г.) давала магчымасць спакойна глядзець на ўступкі ім беларускіх земляў[2]. Адсюль відаць, такая стрыманасць да праблем Заходняга фронту. Нават пасля падзення Мінска ў друку гэтаму факту не было нададзена вялікай увагі. Чытачы Беларусі запэўніваліся ў тым, што не адбылося нічога страшэннага. Некаторыя газеты змясцілі паведамленне аб гэтым толькі праз некалькі дзён. Так, газета "Факел" змясціла яго толькі 12 жніўня. У гэтым жа нумары быў змешчаны артыкул "Тюмень и Минск". Яго аўтар, М. Базараў пісаў: "Что важнее на весах великой борьбы за свободу — Тюмень или Минск? Не должно быть двух разноречивых мнений: ясно, что приобретение Тюмени важнее потери Минска"[3]. З аднаго боку, гэта быў не вельмі эфектыўны прыём агітацыі, каб не дапускіць поўную дэмаралізацыю войск. З другога — газеты ілюстроўвалі афіцыйную пазіцыю цэнтральных улад у адносінах да беларускіх тэрыторый. Яна прагучала ў прамове Л. Троцкага ў Массавеце 26 жніўня 1919 г. і была змешчана ў друку. "О Западном фронте мы можем сказать с полной уверенностью, — говорил он, — наступление белогвардейцев представляет ничтожную величину в сравнении с врагом на востоке и юге..."[4]. Тым самым становяцца зразумелымі акцэнты друку Заходняга фронту і Беларусі, падпарадкаванага Маскве. Адсюль і лёгкадумныя ацэнкі наконт здачы Мінска. Газета "Факел" запэўнівала сваіх чытачоў, што Чырвоная армія на працягу 1 — 2 тыдняў ліквідуе Мінскі прарыў і нанясе ўдар па ворагу[5].

Аднак аб падзеях на Заходнім фронце праз месяц перасталі пісаць зусім. З затуханнем тут актыўных баявых дзеянняў, калі палякі амаль дасягнулі таго, чаго хацелі, ваенны і грамадзянскі друк Беларусі

[1] Звезда. 1919. 5 жніўня.

[2] Какурин Н.Е. Как сражалась революция. М., 1990. Т. 2. С. 206.

[3] Факел. 1919. 12 жніўня.

[4] Там жа. 30 жніўня.

[5] Там жа. 20 жніўня.



пераключыўся на праблемы, звязаныя з Паўднёвым фронтам. І толькі ў кастрычніку 1919 г., у сувязі з выхадам войск Юдзеніча к Петраграду, зноў у друку з'явіліся яркія лозунгі, заклікі, аншлагі, якія звалі абараніць "колыбель революции"[1].

З разгромам войск Юдзеніча пад Петраградам праблемы Заходняга фронту зноў перасталі турбаваць рэдакцыі газет. Нічога ў іх не гаварылася аб лёсе беларускага народа і тэрыторыях, захопленых Польшчай. Не было і хуткага "контрманевра", які абяцалі ў друку[2]. Беларусь аказалася, з аднаго боку, пад уплывам Савецкай Расіі, з другога — акупіраванай Польшчай. Такім чынам, матэрыялы друку паказваюць, што на старонках ваенных газет Заходняга фронту і партыйна-савецкіх газет Беларусі амаль не звярталася ўвагі на лёс беларускага народа. Матэрыялы друку мала былі звязаны з падзеямі на Польскім фронце і непасрэдным рашэннем тых задач, якія стаялі перад часцямі 16 арміі. Яны насілі пераважна агульнапалітычны характар, без уліку і выдзялення нацыянальных аспектаў і мясцовых асаблівасцей. Хоць на фронце і існавалі нацыянальныя беларускія фарміраванні, матэрыялы друку не былі накіраваны на тое, каб жывіць нацыянальныя пачуцці жыхароў Беларусі і чырвонаармейцаў, паколькі большая частка байцоў Беларуска-Літоўскай арміі павінна была выконваць функцыі, якія не былі звязаны з абаронай іх родных месцаў. Гэта дазваляла бальшавікам за кошт тэрытарыяльных уступак рашаць свае амбіцыйныя задачы і ўтрымліваць уладу, што з'яўлялася галоўнай іх мэтай.

## ДА ПЫТАННЯ АБ УТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА КАМІТЭТА АБ'ЯДНАНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (САКАВІК — ЛІПЕНЬ 1917 Г.)

Да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Мінску меліся трывалыя перадумовы для ўтварэння разнастайных партыйных арганізацый. Іх асноваю маглі зрабіцца асобныя раз'яднаныя члены як агульнарасійскіх, так і мясцовых нацыянальных партый. У сваёй большасці гэтыя людзі з'яўляліся працаўнікамі грамадскіх арганізацый, якія абслугоўвалі Заходні фронт: Усерасійскага Земскага Саюза, Саюза Гарадоў, Чырвонага Крыжа, бежанскіх арганізацый. Сярод іх А.Белазёраў, С.Басіст, А.Краўчанка, П.Кашчанка, М.Міхайлаў (Фрунзе), І.Несцераў, В.Канаплёў, К.Петрусевіч, С.Рэшатаў, Б. Позерн, В.Яхантаў і інш. Першымі актамі іх сумеснай дзейнасці пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі сталі: дапамога мясцовай

[1] Краскоармеец. 1919. 25 кастрычніка; 30 кастрычніка; 1 лістапада; РОСТА. 1919. 24 кастрычніка.

[2] Факел. 1919. 21 жніўня.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ